**МЕХМАТУ БДУ 65 ГАДОЎ!**
Пра гісторыю факультэта паразмаўлялі з прафесарам А. Б. Антаневічам
Стар. 2

**НАЙЛЕПШЫЯ ВЫПУСКНІКІ БДУ – 2023**
Спыталі пераможцаў намінацыі «Найлепшы выпускнік» пра першае працоўнае месца і планы пасля выпуску
Стар. 4–5

**ГАСПАДЫНЯ ВУЧЭБНАГА КОРПУСА ФМА**
Наш карэспандэнт правяла працоўны дзень з камендантам будынка ФМА Святланай Ярковіч
Стар. 6

**«ПАЗНАЁМІЛІСЯ НА ТРЭНІРОЎЦЫ»**
Сямейная пара сапраўдных чэмпіёнаў, якія выкладаюць фізічную культуру ў БДУ
Стар. 7



Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

*Пераможца V і XV Нацыянальных конкурсаў друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыях «Найлепшая шматтыражная газета», «Найлепшыя матэрыялы навуковай, навукова-папулярнай тэматыкі»*

21 чэрвеня 2023 года, № 6 (2271)


## Міжуніверсітэцкае супрацоўніцтва з кітайскімі партнёрамі: вынікі і планы

Новыя вектары супрацоўніцтва з кітайскімі ВНУ былі вызначаны падчас візіту ў КНР дэлегацыі БДУ на чале з рэктарам Андрэем КАРАЛЁМ.

Адным з буйных стратэгічных партнёраў БДУ, бясспрэчна, выступае Далянскі політэхнічны ўніверсітэт, супрацоўніцтва з якім развіваецца ў рамках падпісанага ў 2007 годзе пагаднення. На дадзены момант глабальным праектам стала адкрыццё сумесных інстытутаў ДПУ–БДУ і БДУ–ДПУ. Новыя кірункі супрацоўніцтва абмеркавалі падчас сустрэчы рэктары ВНУ Андрэй Кароль і Цзя Чжэньюань.

Вынікі працы за мінулы навучальны год, план на найбліжэйшы перыяд і кадравыя пытанні былі разгледжаны падчас справаздачнага сумеснага пасяджэння двух інстытутаў. Бакі абмеркавалі перспектывы правядзення люстраных летніх школ на базе двух універсітэтаў і адкрыцця на базе ДПУ–БДУ ў 2024/2025 навучальным годзе новай спецыяльнасці «фатоніка».



*Андрэй Кароль і Цзя Чжэньюань падчас наведвання беларускай дэлегацыяй Далянскага політэхнічнага ўніверсітэта (КНР)*

**У РАМКАХ НАВЕДВАННЯ ДПУ ПРАЙШЛО ГАДАВОЕ ПАСЯДЖЭННЕ САВЕТА РЭСПУБЛІКАНСКАГА ІНСТЫТУТА КІТАЯЗНАЎСТВА ІМЯ КАНФУЦЫЯ (РІКК) ЗА 2022-2023 ГАДЫ.**

Дырэктар РІКК БДУ Анатоль Тозік прадставіў вынікі адукацыйнага і навукова-даследчага працэсаў у РІКК за 2022-2023 навучальны год і асноўныя задачы на будучы.

У ліку дасягненняў былі пазначаныя паспяховая падрыхтоўка школьных настаўнікаў кітайскай мовы, адкрыццё магістратуры «Методыка выкладання кітайскай мовы ва ўстановах адукацыі», распрацоўка новых навучальных праграм дадатковай адукацыі дарослых «Кітайскі традыцыйны жывапіс. Кветкі і птушкі» і «Кітайскі традыцыйны жывапіс. Жывёлы ўсходняга календара», арганізацыя міжнародных кваліфікацыйных экзаменаў, актыўная навукова-вучэбна-метадычная дзейнасць па забеспячэнні вывучэння кітайскай мовы ў Беларусі. Сярод вынікаў плённай працы былі адзначаныя манаграфія «Кітайская мова ў адукацыйнай прасторы Беларусі», сумесная праца з НАН Беларусі над акадэмічным Кітайска-беларускім слоўнікам, выданне школьных падручнікаў і зборніка «Канфуцый сказаў: 100 выслоўяў і думак вялікага Настаўніка па-беларуску» і інш. У гэтым навучальным годзе ў кабінетах Канфуцыя і цэнтрах вывучэння кітайскай мовы і культуры РІКК прайшлі навучанне каля дзвюх тысяч чалавек.

Паспяхова прайшлі адукацыйныя мерапрыемствы «Беларуская рэспубліканская студэнцкая алімпіяда па кітайскай мове», «Школа маладога кітаязнаўца», конкурс мастацкіх перакладаў з кітайскай на рускую і беларускую мовы «Зерцало слов» і інш.

Прыярытэтнымі задачамі на наступны год дырэктар РІКК назваў арганізацыю двухтыднёвай стажыроўкі ў ДПУ для 100 беларускіх настаўнікаў кітайскай мовы, распрацоўку новых праграм павышэння кваліфікацыі. Таксама РІКК працягне працу па развіцці дыстанцыйнай формы выкладання кітайскай мовы для максімальнага ахопу слухачоў з усіх рэгіёнаў Беларусі і блізкага замежжа.

У рамках пасяджэння адбыліся выбары членаў Савета РІКК. Ад беларускага боку абралі першага прарэктара Дзмітрыя Курловіча.

Як адзначыў Андрэй Кароль, РІКК БДУ з'яўляецца яркім прыкладам паспяховага партнёрства БДУ і ДПУ, а ў больш шырокім кантэксце – супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Кітаем у галіне адукацыі. Сёння БДУ падпісана больш за 90 пагадненняў аб супрацоўніцтве з кітайскімі ўстановамі адукацыі, 72% ад агульнай колькасці замежных навучэнцаў у БДУ складаюць кітайскія грамадзяне. Таксама кіраўнік ВНУ выказаў надзею, што беларуска-кітайскае партнёрскае ўзаемадзеянне ў галіне адукацыі стане яшчэ больш цесным і выніковым.

Праграма наведвання ДПУ ўключала таксама сустрэчу Андрэя Караля з кіраўніцтвам Цэнтра вывучэння Беларусі. Ён быў адкрыты ў 2019 годзе на базе названай кітайскай ВНУ з мэтай даследавання беларуска-кітайскага супрацоўніцтва ў галіне вышэйшай адукацыі, гандлёва-эканамічнага ўзаемадзеяння дзвюх краін. Для ўмацавання бібліятэчнага фонду цэнтру падораныя навуковыя і навучальныя кнігі, выдадзеныя ў БДУ.

**У БДУ СТВОРАЦЬ ЦЭНТР ПА ВЫВУЧЭННІ ДЗЕЙНАСЦІ ШАНХАЙСКАЙ АРГАНІЗАЦЫІ СУПРАЦОЎНІЦТВА (ШАС).**

Такое рашэнне абумоўлена падпісаным у Кітаі пагадненнем аб адкрыцці ў БДУ даследчага цэнтра Кітайска-ШАСаўскай гандлёва-эканамічнай акадэміі Універсітэта Ціндаа. Подпісы пад дакументам паставілі рэктары Андрэй Кароль і Ся Дунвэй. Дадзеная падзея вельмі сімвалічная, паколькі адбылася ў дзень заснавання ШАС. Міжнародная арганізацыя была заснавана 15 чэрвеня 2001 года лідарамі Кітая, Расіі, Казахстана, Таджыкістана, Кыргызстана і Узбекістана.

Цэнтр будзе працаваць на базе ФМА БДУ. Гэта ўзмоцніць эфектыўнасць аказання экспертнага садзейнічання распаўсюджванню інфармацыі аб дыялогавым партнёрстве Беларусь–ШАС, актывізуе развіццё эканамічных сувязяў, абменаў у сферы навукі, культуры і адукацыі. Цэнтр стане інтэлектуальнай пляцоўкай па правядзенні даследаванняў у галіне міжнароднай дзейнасці, гісторыі, права, гандлю, эканомікі і культуры ШАС. Плануецца таксама рэалізацыя буйных сумесных даследчых праектаў з удзелам Кітая ў галіне палітыкі, бяспекі, гандлю, інвестыцый, прамысловасці, энергетыкі, транспарту, фінансаў, малога і сярэдняга бізнесу, навукі і тэхналогій, экалогіі, развіцця чалавечых рэсурсаў і інш.

Функцыянаванне цэнтра ахопіць некалькі кірункаў. Адукацыйнае, навуковае, міжнароднае ўзаемадзеянне прадугледжвае правядзенне міжнародных канферэнцый, форумаў і выступленняў экспертаў для аказання інтэлектуальнай падтрымкі ШАС, краінам-удзельніцам праграмы «Адзін пояс, адзін шлях». Таксама пагадненне прапісвае арганізацыю акадэмічнага абмену студэнтамі для сумеснага навучання; распрацоўку праграм па сумеснай падрыхтоўцы спецыялістаў.

Падчас сустрэчы рэктараў Андрэя Караля і Ся Дунвэя адбылося абмеркаванне прадметнага напаўнення падпісанага ў 2022 годзе Мемарандума аб узаемаразуменні. У прыватнасці, размова ішла аб падрыхтоўцы кадраў найвышэйшай кваліфікацыі, арганізацыі сумеснага навуковага кіраўніцтва аспірантамі і дактарантамі. Вынікам сустрэчы стала падпісанне ВНУ яшчэ аднаго пагаднення аб праграме навучання за мяжой, дзе дэталёва адлюстраваны ўмовы абмену навучэнцамі.

Працягнулася тэматыка дзейнасці ШАС на пляцоўках Форуму народнай дыпламатыі, Форуму гарадоў-пабрацімаў ШАС і Форуму гуманітарных абменаў у галіне адукацыі ў г. Ціндаа. Яны прысвечаны пяцігоддзю з дня правядзення саміту ШАС у Ціндаа і накіраваны на паглыбленне адукацыйных абменаў сярод членаў гэтай арганізацыі. Вітаючы ўдзельнікаў, рэктар БДУ адзначыў важнасць форумаў для Беларусі, паколькі ў 2022 годзе пачалася працэдура прыёму краіны ў ШАС. «Упэўнены, што гэты форум адкрые новыя магчымасці для пашырэння адукацыйнага супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі», – рэзюмаваў Андрэй Кароль.

Са слоў рэктара, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт таксама ўносіць важкі ўклад у набліжэнне гэтай важнай для краіны падзеі. Ва ўніверсітэце навучаецца звыш трох тысяч кітайскіх грамадзян. Гэта 30 % ад усёй колькасці студэнтаў з Кітая, якія вучацца ў Беларусі. З універсітэтамі КНР БДУ рэалізуе шэсць сумесных адукацыйных праграм па дзевяці напрамках. За апошняе дзесяцігоддзе больш за 130 дэлегацый адукацыйных і навуковых устаноў, а таксама органаў дзяржаўнага кіравання Кітая наведалі БДУ.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

УНІВЕРСІТЭТ
21 чэрвеня 2023 года, № 6 (2271)

Механіка-матэматычны факультэт БДУ адзначае 65-гадовы юбілей. Прафесар Анатоль АНТАНЕВІЧ, можна смела сказаць, равеснік мехмата: ён паступіў у БДУ менавіта ў 1958 годзе, калі адбыўся падзел фізіка-матэматычнага факультэта. Пакуль ён быў студэнтам і не падазраваў, што з БДУ будзе звязана ўсё яго жыццё.



*Анатоль Барысавіч Антаневіч скончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт у 1963 годзе. Цяпер ён доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар кафедры функцыянальнага аналізу і аналітычнай эканомікі, аўтар навуковых прац па функцыянальным аналізе і дыферэнцыяльных ураўненнях. Навуковец распрацаваў новы падыход да даследавання функцыянальна-дыферэнцыяльных ураўненняў і нелакальна-краявых задач, заснаваных на вывучэнні адпаведных аператарных алгебр. Доктарскую дысертацыю «Метад функцыянальных ураўненняў у тэорыі краявых задач» абараніў у 1989 годзе ў Маскоўскім універсітэце імя М. В. Ламаносава. Аўтар звыш 200 навуковых і метадычных работ, у тым ліку 5 манаграфій, выдадзеных на англійскай мове. Лаўрэат прэміі імя А. Н. Сеўчанкі, уладальнік звання «Выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь».*

# Гісторыя факультэта вачыма відавочцы

## У гэтым годзе механіка-матэматычнаму факультэту БДУ 65 гадоў!

### «Факультэт мяняўся імкліва»

– Успамінаю, як тады выглядаў факультэт. У той момант два факультэты размяшчаліся ў цяперашнім будынку рэктарата. Месца там было няшмат, і два дэканы, Д. А. Супруненка і М. П. Халімановіч (матэматычнага і фізічнага факультэтаў адпаведна), сядзелі ў адным кабінеце. Аніводная з кафедраў не мела свайго кабінета.

Першапачаткова на матэматычным факультэце было ўсяго 5 кафедраў: алгебры – пад кіраўніцтвам прафесара Д. А. Супруненкі, вылічальнай матэматыкі – акадэміка У. І. Крылова, дыферэнцыяльных ураўненняў – акадэміка М. П. Яругіна, геаметрыі – дацэнта Л. К. Тутаева, матэматычнага аналізу – дацэнта М. В. Ламбіна.

Факультэт мяняўся імкліва. Памятаю, у 1958 годзе набіралі 75 чалавек, потым дадалі яшчэ, атрымалася 100. А праз 15 гадоў набіралі ўжо 350 будучых матэматыкаў. Менавіта гэты набор быў самы вялікі. І нават калі ў 60-м годзе мы пераехалі ў галоўны корпус БДУ, месца не хапала і тады. Быў перыяд, калі ў адным кабінеце туліліся адразу 4 кафедры. Аднак гэта не перашкаджала эфектыўнай працы, і падрыхтоўка студэнтаў была дастаткова высокая.

У 1970 г. на базе трох кафедраў матэматычнага факультэта – вылічальнай матэматыкі, дыферэнцыяльных ураўненняў і прыкладной матэматыкі – быў створаны факультэт прыкладной матэматыкі.

*З цягам часу на матэматычным факультэце ўтвараліся новыя кафедры, распрацоўваліся запатрабаваныя кірункі. Так, у 1975 г. пачалася падрыхтоўка кадраў па спецыяльнасці «механіка», і факультэт стаў называцца механіка-матэматычным.*

Цяпер у склад факультэта ўваходзяць 10 кафедраў, цэнтр адукацыйных і інфармацыйных тэхналогій, навукова-даследчая лабараторыя прыкладной механікі. Навучаецца больш за тысячу студэнтаў, працуюць 26 прафесараў і дактароў навук, 65 дацэнтаў і кандыдатаў навук.

### «Чалавек, які адчыніў дзверы ў матэматыку»

– Калі я паступаў, найбольш аўтарытэтным сярод факультэцкіх выкладчыкаў быў прафесар Дзмітрый Аляксеевіч Супруненка. Ён тады ўжо займаў пасаду дэкана і быў адзіным штатным доктарам навук. Маім навуковым кіраўніком дыпломнай працы быў дацэнт Арон Міхайлавіч Родаў. Ён чытаў матэматычны аналіз, умеў захапіць студэнтаў сваім прадметам, паднесці нейкую тонкасць з найвялікшай цікавасцю. Пасля многія выпускнікі ўспаміналі Родава як чалавека, які адчыніў перад імі дзверы ў матэматыку.

На факультэт запрашалі выдатных навукоўцаў, тут працавалі многія цікавыя асобы, пра кожнага з якіх можна напісаць асобна. Сярод загадчыкаў кафедраў былі акадэмікі Я. А. Барбашын, Ф. Д. Гахаў, М. П. Яругін, У. І. Крылоў, У. П. Платонаў. Не магу не ўспомніць члена-карэспандэнта НАН Беларусі Якава Валянцінавіча Радыну. Яму было ўсяго 28 гадоў, калі ён стаў загадчыкам кафедры функцыянальнага аналізу, а загадваў ён ёй 42 гады.



Выкладчыкі матэматычнага факультэта БДУ(1963 год)



Турысцкі паход універсітэцкай групы (г. Нарыльск, 1974 год)



Кафедра функцыянальнага аналізу (1982 год)



Анатоль Антаневіч сярод аспірантаў-футбалістаў (1989 год)

### «Спачатку персанальных камп'ютараў было няшмат, і мы жартавалі, што яны калектыўныя»

– У першыя гады самым «прасунутым» тэхнічным абсталяваннем былі электрычныя арыфмометры «Рэйнметал». На іх праходзілі практычныя заняткі па вылічальнай матэматыцы. Потым з'явіліся ЭВМ, а за імі і персанальныя камп'ютары. Былі абсталяваны спецыяльныя лабараторыі для заняткаў.

Спачатку персанальных камп'ютараў было няшмат, і мы з калегамі жартавалі: «Як яны могуць быць персанальнымі, калі яны калектыўныя?» Цяпер я ўжо нават не магу адказаць, колькі на факультэце вылічальнай тэхнікі. Але ўсё ж мне матэматыка падабаецца тым, што яна не поўнасцю залежыць ад абсталявання. Для таго, каб займацца гэтай навукай, патрэбныя здольнасці, веды, дошка з крэйдай і ўпэўненасць, што гэта патрэбная справа.

### «Студэнты зараз больш прагматычныя»

– Раней, дарэчы, студэнты не адразу паступалі на пэўную спецыяльнасць. Спачатку яны два гады вучыліся на агульным патоку і толькі потым размяркоўваліся па напрамках, калі ўжо вызначаліся, што ім бліжэйшае. Гэта спрыяла павышэнню цікавасці да вучобы.

Выпускнікі нашага факультэта былі запатрабаваныя, размеркаванне адбывалася па ўсім Савецкім Саюзе. Яны ішлі працаваць у НДІ і на перадавыя прадпрыемствы, працавалі практычна ва ўсіх ВНУ Беларусі.

З намі вучыліся і замежнікі. Першыя ў 1961 годзе, пасля рэвалюцыі на Кубе, да нас на вучобу прыехалі кубінскія студэнты. Для іх вылучылі інтэрнат, але пасялілі так, каб у пакоі быў хоць адзін з мясцовых студэнтаў. Тады нават зрабілі «кубінскую» сталовую на вуліцы Валадарскага, хадзіць туды можна было толькі па пропусках. Пазней прыязджалі вучыцца студэнты з В'етнама, Алжыра і іншых краін.

Сучасныя студэнты вельмі адрозніваюцца ад студэнтаў мінулага. Яны сталі больш прагматычнымі, імкнуцца як мага раней пабудаваць кар'еру і сумяшчаць працу і вучобу. У выніку працэнт тых, каму патрэбныя не веды, а дыплом, на мой погляд, вырас. Мае равеснікі больш часу прысвячалі вучобе. Пры гэтым я заўважыў, што колькасць адораных навучэнцаў, якія сапраўды жадаюць займацца матэматыкай, не змянілася.

### «Матэматычнаму напрамку патрабуецца падтрымка»

Практычна ўсё свядомае жыццё я правёў на механіка-матэматычным факультэце. Я адзін застаўся з тых, хто вучыўся або працаваў у ім усе гады існавання. Таму вельмі хвалююся, калі тут нешта ідзе не так. Я лічу, што цяпер матэматычнаму напрамку навукі патрабуецца асаблівая падтрымка. Выклікае неспакой стан падрыхтоўкі кваліфікаваных кадраў для выкладчыцкай працы. Апошняя абарона доктарскай дысертацыі па спецыяльнасці «матэматыка» на нашым факультэце была 20 гадоў таму. Трэба прыцягваць маладых людзей у навуку.

Аднойчы ў выдатнага беларускага матэматыка М. П. Яругіна падчас інтэрв'ю спыталі: «А што змянілася ад таго, што вы даказалі яшчэ адну тэарэму? Бо іх тысячы і тысячы!» А ён адказаў: «Павысілася культура чалавецтва». І я згодны з тым, што важнасць матэматычнага кірунку вызначаецца не толькі прыкладнымі аспектамі і атрыманымі дывідэндамі. Узровень развіцця матэматыкі – гэта адзін з паказчыкаў агульнага развіцця краіны.

**Ганна КАЗАКОВА**

# БДУ ў міжнароднай адукацыйнай прасторы

Акадэмічную мабільнасць у БДУ абмеркавалі з намеснікам начальніка ўпраўлення міжнародных сувязяў Уладзімірам ГАЛЫНСКІМ.

Адукацыя заўсёды была стваральнай сілай, «цэментам» для выбудоўвання міжнацыянальных зносін і культурнага ўзаемадзеяння розных краін. Абмены студэнтамі і выкладчыкамі, агульныя канферэнцыі, дамовы аб партнёрстве і многае іншае дапамагае ВНУ наладзіць міжнароднае акадэмічнае супрацоўніцтва і забяспечыць экспарт адукацыйных паслуг.






– Акадэмічная мабільнасць – адзін з найважнейшых складнікаў працэсаў інтэрнацыяналізацыі вышэйшай адукацыі і інтэграцыі ВНУ ў міжнародную адукацыйную прастору. Для БДУ, як і для любога іншага ўніверсітэта, гэта адзін з інструментаў прасоўвання ўласнага брэнда, а таксама брэнда беларускай адукацыі за мяжой.

Супрацоўніцтва вышэйшых навучальных устаноў ажыццяўляецца ў рамках міжнародных праграм пры падтрымцы ўрадаў розных краін альбо на аснове міждзяржаўных, міжведамасных або міжуніверсітэцкіх пагадненняў. Фінансаванне мабільнасці ажыццяўляецца з розных крыніц звычайна ў выглядзе стыпендый і грантаў, што выдзяляюцца ўніверсітэтамі, фондамі, кампаніямі або ўрадамі дзяржаў. Аднак не выключана, што праграма прадугледжвае частковае або поўнае самафінансаванне.

На дзяржаўным узроўні праграмы абмену ажыццяўляюцца з Казахстанам, Кыргызстанам, Таджыкістанам, Туркменістанам, В'етнамам, Кітаем, Манголіяй, Сірыяй і Егіптам. Яны прадугледжваюць вызваленне студэнтаў ад выплаты за навучанне і атрыманне стыпендыі. Конкурсы арганізуе Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь сумесна з пасольствамі краін.

БДУ мае больш за 500 дамоў аб супрацоўніцтве з замежнымі ВНУ, аднак фінансавыя ўмовы абменаў залежаць ад краіны і ўніверсітэта-партнёра. Як правіла, кожная дамова аб супрацоўніцтве прадугледжвае навучанне студэнтаў у ВНУ-партнёрах на працягу 1-2 семестраў па асноўнай або сумежнай спецыяльнасці, кароткатэрміновыя абмены групамі студэнтаў для культурна-азнаямленчай/навучальнай практыкі, удзелу ў летняй школе, а таксама магчымыя стажыроўкі для магістрантаў і аспірантаў. У рамках дамоў паміж ВНУ цяпер рэалізуюцца праграмы абмену студэнтамі БДУ з ВНУ Расіі, Казахстана, Узбекістана, Інданезіі, Кітая, Карэі і Японіі.

**500**
дамоў аб супрацоўніцтве з замежнымі ВНУ мае БДУ

Найбольш запатрабаванымі расійскімі ВНУ сярод студэнтаў БДУ з'яўляюцца Маскоўскі дзяржаўны ўніверсітэт і Санкт-Пецярбургскі дзяржаўны ўніверсітэт, а таксама Ленінградскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна, Маскоўскі гарадскі педагагічны ўніверсітэт, Валгаградскі дзяржаўны ўніверсітэт, Уральскі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт, Універсітэт ІТМА, Цюменскі дзяржаўны ўніверсітэт, Фінансавы ўніверсітэт пры ўрадзе РФ, Балтыйскі федэральны ўніверсітэт імя І. Канта.

Актыўнае супрацоўніцтва наладжана і з ВНУ азіяцкіх дзяржаў: Рэспублікі Карэя, Кітайскай Народнай Рэспублікі і Японіі. Шэраг карэйскіх універсітэтаў – Універсітэты Кунмін, Ханкук, Ульсана, – прапануюць студэнтам БДУ навучанне на працягу аднаго альбо двух семестраў. Таксама ўрад Рэспублікі Карэя дае студэнтам магчымасць прыняць удзел у конкурсе на атрыманне стыпендыі па праграме Global Korean Scholarship (GKS), адной з умоў удзелу ў якім з'яўляецца валоданне карэйскай мовай на ўзроўні B1.

Дамовы аб супрацоўніцтве падпісаны з вялікай колькасцю ВНУ Кітайскай Народнай Рэспублікі. Харбінскі ўніверсітэт навукі і тэхналогій, Усходне-Кітайскі педагагічны ўніверсітэт, Хэнанскі ўніверсітэт, Далянскі політэхнічны ўніверсітэт і іншыя гатовыя прыняць студэнтаў БДУ як для праходжання навучання па спецыяльнасці, так і для навучання на курсах кітайскай мовы.

Дамовы аб супрацоўніцтве з такімі ВНУ Японіі, як Цукубскі ўніверсітэт і Універсітэт Фукусімы, прадугледжваюць абмен студэнтамі. Японскі ўрад таксама прапануе студэнтам БДУ паўдзельнічаць у конкурсе на атрыманне стыпендыі па праграме MEXT.

У міжуніверсітэцкіх праграмах абмену могуць удзельнічаць студэнты з добрай паспяховасцю, якія не маюць акадэмічных запазычанасцяў, пачынаючы з другога года навучання. Студэнты апошняга года навучання не могуць прымаць удзел у праграмах абмену ў апошнім семестры.

Для ўдзелу ў праграме абмену навучэнцу неабходна выбраць пажаданую ВНУ са спісу тых, з якімі БДУ мае пагадненне, выбраць адпаведныя дысцыпліны і скласці сабе меркаваны план навучання ў замежнай ВНУ. Затым трэба звярнуцца на факультэт (як правіла, да намесніка дэкана або дэкана) з мэтай афармлення дакладной запіскі ад факультэта аб рэкамендацыі да праходжання навучання (з указаннем асабістых даных студэнта і сярэдняга бала). Пасля гэтага дакументы падаюцца ва ўпраўленне міжнародных сувязяў.

Паважаныя студэнты, будзьце ўважлівыя: дакументы падаюцца на наступны семестр у пачатку бягучага семестра, дакладная дата падачы дакументаў у кожнага ўніверсітэта і ў кожнай праграмы свая!

Усю неабходную інфармацыю можна знайсці на сайце УМС (ums.bsu.by) у раздзеле «Акадэмічная мабільнасць» і ў раздзеле «Навіны». У выпадку абвяшчэння конкурсу або адкрыцця стыпендыяльных праграм мы размяшчаем пра гэта інфармацыю, распаўсюджваем звесткі на факультэтах. У кожным дэканаце студэнту таксама могуць дапамагчы, падказаць і праінфармаваць аб магчымай акадэмічнай мабільнасці.

## Пытанні ад студэнтаў:

***Дзе студэнты БДУ могуць вучыцца па праграме двайных дыпломаў? Колькі навучэнцаў ужо атрымалі такія дыпломы?***

***Пранікава Арына, журфак, 4 курс***

– Рэалізуюцца пагадненні аб двайных дыпломах з 10 універсітэтамі Кітая, Расіі, Узбекістана, Казахстана, Таджыкістана. З іх можна вылучыць 3 найбольш цікавыя праграмы, а поўны пералік размешчаны на сайце (https://ums.bsu.by/ru/international-partnership/double-degree-studies).

З Далянскім політэхнічным універсітэтам мы праводзім навучанне па 3 спецыяльнасцях у Беларусі і 2 спецыяльнасцях у Кітаі. Схема навучання 4 + 0, г. зн. студэнт вучыцца ў тым універсітэце, дзе паступіў, але частку лекцый яму выкладаюць прафесары з універсітэта-партнёра. На выхадзе ўсе студэнты атрымліваюць 2 дыпломы. Праграма БДУ–ДПУ – самая масавая. Выпуск беларускіх студэнтаў сёлета будзе першым. У Кітаі ўжо было 2 выпускі па 80 студэнтаў.

МДУ імя М. В. Ламаносава і гістарычны факультэт БДУ рэалізуюць сумесную эксперыментальную праграму паглыбленай вышэйшай адукацыі (магістратуры) «Гісторыя беларускай дыяспары». Тэрмін навучання – 2 гады. Студэнты паступаюць у БДУ або МДУ, схема навучання – 1 год у МДУ + 1 год у БДУ (студэнты залічваюцца адразу ў 2 універсітэты). Мовы навучання – руская і беларуская. Выпускаюцца 4 чалавекі ў год, яны атрымліваюць дыплом БДУ і дыплом МДУ.

Юрыдычны факультэт БДУ і РУДН (Масква, Расія) забяспечваюць сумесную падрыхтоўку магістрантаў па профілі «юрыспрудэнцыя». Тэрмін навучання па гэтай эксперыментальнай праграме складае 2 гады. Навучаюцца 2-4 чалавекі. У гэтым годзе будзе першы выпуск. Схема навучання – 0,5+1+0,5. Студэнты паступаюць у БДУ або ў РУДН, пры гэтым залічаныя ў абодва ўніверсітэты. 1 і 4 семестр навучанне праходзіць у той ВНУ, куды студэнт паступаў, а 2 і 3 семестр – у ВНУ-партнёры. Выпускнікі атрымліваюць і дыплом БДУ, і дыплом РУДН.

***Сярэдні бал для ўдзелу ў праграме абмену павінен быць вышэйшы за 7, а ў Японію – вышэйшы за 8. Чаму менавіта ў Японіі патрабаванні больш жорсткія?***

***Кацярына Блінова, 1 курс, Інстытут бізнесу БДУ***

– Наяўнасць такога сярэдняга бала – гэта патрабаванне прымаючага боку, г. зн. японскіх ВНУ.

***Хацелася б даведацца, колькі беларускіх студэнтаў і куды адправіліся па абмене за апошнія 2-3 гады?***

***Крысціна Пятрашка, 1 курс, Інстытут бізнесу БДУ***

– У 2021 годзе ў рамках акадэмічнай мабільнасці ў замежныя ВНУ выехаў 131 студэнт БДУ, у 2022 – 108 (з іх у Расію 87, у Японію 3, у Карэю 2). Летась студэнты не выязджалі ў Кітай праз пандэмію і каранцін.

За перыяд са студзеня 2023 года па цяперашні час у замежныя ВНУ выехалі 23 студэнты БДУ: у Інданезію – 1 чалавек, у Казахстан – 2 чалавекі, у Кітай – 1 чалавек (каранцін быў часткова адменены ў канцы 2022 года), у Карэю – 1 чалавек, у Расію – 12 чалавек, у Японію – 3 чалавекі.

**Дар'я ПАЎЛЮЧУК**

УНІВЕРСІТЭТ
21 чэрвеня 2023 года, № 6 (2271)

# Размеркаванне ў самас

## Дзе будуць працаваць найлепшыя в

Чэрвень. Студэнты здаюць свае апошнія экзамены, абараняюць дыпломы і думаюць пра тое, як складзецца іх лёс пасля заканчэння ўніверсітэта… Якім шляхам пойдуць маладыя спецыялісты, мы даведаліся ў пераможцаў намінацыі «Найлепшы выпускнік БДУ – 2023».



**Ульяна Паўленка (біялагічны факультэт, бюджэтная форма атрымання адукацыі):**

– З пачатку трэцяга курса і па гэты дзень я працую на біялагічным факультэце лабарантам кафедры заалогіі і па сумяшчальніцтве стажорам малодшага навуковага супрацоўніка. Таксама займаюся навуковай дзейнасцю. На чацвёртым курсе я праходзіла педагагічную практыку ў сярэдняй школе №53 горада Мінска, вяла ўрокі біялогіі ў 8-х і 10-х класаў. Пераддыпломную практыку прайшла на кафедры заалогіі біялагічнага факультэта. Пры паступленні я выбірала такі ўніверсітэт, які даў бы мне магчымасць стаць выкладчыкам у ВНУ, і мэтанакіравана пайшла на спецыяльнасць навукова-педагагічная дзейнасць. Аднак, каб выкладаць у ВНУ, трэба скончыць магістратуру. Менавіта таму я цвёрда вырашыла пасля заканчэння бакалаўрыяту працягваць навучанне. У цэлым я вельмі задаволеная сваім размеркаваннем. Чаканні мае апраўдаліся – мяне размеркавалі на кафедру заалогіі.



**Даніл Дзенгалёў (факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі, бюджэтная форма атрымання адукацыі):**

– Я стажыраваўся і працаваў у «Яндэксе», там жа праходзіў практыку і туды ж размеркаваўся. Гэта, най мой погляд, найлепшая кампанія ў Беларусі для праграмістаў. Пасля другога курса праходзіў стажыроўку ў камандзе, якая займаецца беспілотнымі аўтамабілямі, у якасці распрацоўшчыка на мове C++. Зараз працую распрацоўшчыкам машыннага навучання. Наша каманда займаецца ўпарадкаваннем пошукавай выдачы ў «Яндэксе». Пошукавая выдача – гэта тыя сайты, якія пашуковік выдае пры заданні нейкага запыту. Мы выкарыстоўваем алгарытмы машыннага навучання для выдачы аптымальнага парадку, які ў найбольшай ступені будзе адпавядаць інтарэсам карыстальніка.



**Серафім Аўсіевіч (Інстытут тэалогіі імя св. Мяфодзія і Кірыла, бюджэтная форма атрымання адукацыі):**

– Падчас вучобы не працаваў, але хадзіў у царкву, дзе аказваў пасільную дапамогу. У нас у інстытуце ёсць 3 віды практыкі: літургічная, педагагічная і рэлігіязнаўчая. Літургічная практыка праходзіць у капліцы Інстытута тэалогіі на першым курсе. Педагагічную практыку я праходзіў у Мазыры, у гімназіі імя Я.Купалы, дзе вучыўся з 1 па 11 клас. Таксама праходзіў практыку на ФФСН, выкладаў рэлігіязнаўчыя дысцыпліны. Рэлігіязнаўчую практыку праходзіў у Сінадальным цэнтры сектазнаўства пад кіраўніцтвам Уладзіміра Аляксандравіча Марціновіча.

З самага дзяцінства я хацеў быць святаром, але па шэрагу прычын быць пасвечаным цяпер я не магу. Таму мне было прапанавана папрацаваць сакратаром канцылярыі Тураўскай епархіі з перспектывай росту да загадчыка канцылярыі, а таксама несці іпадыяканскую паслухмянасць. Я застаўся задаволены сваім размеркаваннем, але застаюцца і іншыя варыянты развіцця падзей. Епіскап Тураўскі і Мазырскі Леанід блаславіў мяне на паступленне ў магістратуру. Калі з змагу прайсці на бюджэтную форму навучання, пытанне з адпрацоўкай будзе часова адкладзена. Ёсць і трэці варыянт, бо павестка з ваенкамата ўжо даўно дайшла да мяне. Я гатовы да любога развіцця падзей, а што будзе — пакажа час.



**Мілвары Аліева (факультэт геаграфіі і геаінфарматыкі, бюджэтная форма атрымання адукацыі):**

– Напрыканцы другога курса мне ўдалося папрацаваць у аграстартапе OneSoil, дзе я займалася маркіроўкай даных. На трэцім курсе ў складзе групы студэнтаў я выйграла грант Міністэрства адукацыі для выканання НДР, звязанай з вывучэннем мікраклімату Мінска. Грант быў гадавы, я ўладкавалася на кафедру фізічнай геаграфіі свету і адукацыйных тэхналогій у якасці стажора малодшага навуковага супрацоўніка. Там жа праходзіла і вытворчую практыку.

Я б хацела працягнуць навучанне ў магістратуры на спецыяльнасці «землеўпарадкаванне, кадастры, геадэзія, геаматыка», прафілізацыя – геаматыка. Летась на яе праходзіў першы набор навучэнцаў.



**Дар'я Песля (факультэт журналістыкі, бюджэтная форма атрымання адукацыі):**

– Працоўны вопыт падчас вучобы я набывала ў івэнт-агенцтве Eventum Globo. Практыку праходзіла ў кампаніі BDS Consulting (1, 2 курс), у ТАА «Белзнешрэклама» (3, 4 курс) і ў рэдакцыі газеты «Іўеўскі край» (пераддыпломная). Планавала працаваць па размеркаванні ў БНТУ, у сектары маркетынгу, спецыялістам па рэкламнай камунікацыі. Чаканні апраўдаліся цалкам: мяне размеркавалі па заяўцы.



**Анатолій Афоненка (факультэт радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій, бюджэтная форма атрымання адукацыі):**

– Прыкладна на другім годзе вучобы ў мяне ўзніклі думкі пра працу, што трэба ўжо вызначацца. У той час вельмі цікавіла сфера праграмавання мікраэлектронікі ўбудаваных сістэм, мікракантролераў, датчыкаў. На трэцім курсе я прайшоў сумоўе і ўладкаваўся на стажыроўку. Але праз два тыдні, хоць стажыроўка прадугледжвае тры месяцы працы, я зразумеў, што не атрымліваецца сумяшчаць вучобу і працу. Вырашыў, што лепш паспяхова давучыцца і потым ужо пачынаць працаваць.



**Аліна Рацькова (факультэт міжнародных адносін, бюджэтная форма атрымання адукацыі):**

– Падчас вучобы я не працавала па спецыяльнасці. На выбар першага працоўнага месца пасля вучобы паўплывалі вытворчая і пераддыпломная практыкі. Вытворчую практыку я праходзіла ў галоўным консульскім упраўленні Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь. І спачатку я «загарэлася» працаваць там. Але на чацвёртым курсе пры напісанні дыпломнай працы я стала задумвацца пра тое, дзе буду працаваць наступныя 2 гады. Па прапанове выпускаючай кафедры я падала рэзюмэ ў Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь. Сумоўе прайшло паспяхова, я была вельмі рада трапіць на пераддыпломную практыку ў цэнтральны банк нашай краіны. Мне далі магчымасць не толькі паспрабаваць сябе як маладога спецыяліста, але і прайсці сумоўі ў розных структурах, каб у канцы вызначыць, дзе менавіта я б хацела працаваць у будучыні. У выніку мяне размеркавалі ва ўпраўленне даследаванняў і стратэгічнага развіцця. Для мяне важна, каб першае месца працы спрыяла павышэнню кваліфікацыі і набыццю карыснага вопыту.

З размеркаваннем сустракаецца кожны студэнт бюджэтнай формы навучання ў нашым універсітэце. Той стэрэатып, што студэнтаў размяркоўваюць не туды, куды б яны хацелі, трэба разбурыць. Хачу адзначыць, што кожны студэнт, які актыўна выяўляў сябе ў перыяд навучання, мае магчымасць выбраць тое ці іншае месца, якое будзе яму даспадобы. Пагадзіцеся, той студэнт, які будзе мець высокі сярэдні бал, высокія паказчыкі ў навуковым або грамадскім жыцці, зможа размеркавацца туды, куды сапраўды хоча. Ягоі сам будучы працадаўца зможа знайсці і запрасіць, і ў яго будуць магчымасці для выбару таго ці іншага месца.



**Алёна Сайка (эканамічны факультэт, бюджэтная форма атрымання адукацыі):**

– Практыку праходзіла ў кансалтынгавай IT-кампаніі «А2 Кансалтынг», на трэцім курсе там жа праходзіла стажыроўку. На чацвёртым курсе, у снежні, пачала працаваць у кампаніі «АтлантКансалт», куды планавала ў далейшым атрымаць размеркаванне. Чаканні апраўдаліся – менавіта туды мяне і размеркавалі.



**Вікторыя Гут (факультэт сацыякультурных камунікацый, бюджэтная форма атрымання адукацыі):**

– Падчас вучобы я не працавала. Практыку праходзіла ў адукацыйнай студыі «Мой панядзелак» і IT-кампаніі Modsen, займалася перакладам тэкстаў па тэматыцы інфармацыйных тэхналогій. Размеркавалася туды, куды хацела, – у прадуктовую кампанію па распрацоўцы дадаткаў Gismart. Працую на англійскай і нямецкай мовах, як і хацела.

# тойнае жыццё
# ыпускнікі БДУ гэтага года?



**Ганна Яблонская (механіка-матэматычны факультэт, бюджэтная форма атрымання адукацыі):**

– Падчас вучобы працавала ў IT-кампаніі Itransition, там жа праходзіла пераддыпломную практыку. З сакавіка працую ў камані «Праграмныя рашэнні плюс», куды і трапіла на размеркаванне. Напрамак маёй прафесійнай дзейнасці – Data Science. Займаюся аналізам даных, распрацоўкай, навучаннем, валідацыяй мадэляў машыннага навучання.



**Клаўдзія Камяк (фізічны факультэт, бюджэтная форма атрымання адукацыі):**

– Я праходзіла практыку ў навукова-даследчай лабараторыі нелінейнай оптыкі і спектраскапіі на сваім факультэце. Пасля выпуску хацела б паступіць у магістратуру.



**Аляксандра Мядзведзева (гістарычны факультэт, бюджэтная форма атрымання адукацыі):**

– Я працавала спачатку ў балетнай школе горада Мінска настаўнікам гісторыі, затым – ва ўніверсітэце спецыялістам па тэхнічным забеспячэнні навучальнага працэсу ў тэхнічнай лабараторыі гістфака. Педагагічную практыку я праходзіла ў гімназіі №20 г. Мінска. Гэта быў бясцэнны вопыт наладжвання зносін з дзецьмі, з кіраўніцтвам школы, з выкладчыкамі. Я паглядзела, як іншыя выкладчыкі падыходзяць да адукацыйнага працэсу, даведалася новае, напрыклад, пра дакументацыю класнага кіраўніка. Пераддыпломную практыку я праходзіла ў дзяржаўнай установе «Занальны дзяржаўны архіў у г. Маладзечна», пазнаёмілася з «унутранай кухняй» працы ў архіве. Гэтая практыка дапамагла мне больш якасна напісаць дыпломную працу. Размеркавалі мяне ў школу №155 г. Мінска. Я задаволеная, што засталася ў Мінску. Размеркаванне я шукала сама. У гэтым годзе планую паступаць у магістратуру, але ў школе буду працаваць, нягледзячы на паступленне ў магістратуру, каб назапашваць стаж і вопыт.



**Абдула Тайханаў (філалагічны факультэт, платная форма атрымання адукацыі):**

– Акрамя вучобы, маё жыццё зараз прысвечана спорту. Улетку па выхадных я працаваў індывідуальным трэнерам па ММА і рэпетытарам па рускай мове. Практыку праходзіў на факультэце. Пасля заканчэння вучобы планую з'ехаць у Амерыку, каб працягнуць спартыўную кар'еру. Дадаткова хацеў бы працаваць перакладчыкам.



**Алена Расолька (Інстытут бізнесу, платная форма атрымання адукацыі):**

– Зараз працую ў рэкламным агенцтве менеджэрам, займаюся з камандай арганізацыяй мерапрыемстваў (карпаратываў, фестываляў, тымбілдынгаў, канферэнцый і г.д.). Падчас вучобы я таксама працавала ў гэтым агенцтве, але выконвала больш дробныя задачы. Мая спецыяльнасць «кіраванне інфармацыйнымі рэсурсамі» звязана з эканомікай, менеджментам (кіраваннем персаналам) і праграмаваннем. Тыя веды ў сферы эканомікі і менеджменту, якія я атрымала ў БДУ, вельмі дапамагаюць у працы. З першага курса я была ў студэнцкім саюзе ўніверсітэта. Гэтая арганізацыя дала мне пачатковы вопыт правядзення мерапрыемстваў, што, на мой погляд, і стала тым «штуршком» да выбару працы ў івэнт-сферы.



**Раман Казакоў (МДЭІ імя А. Д. Сахарава, бюджэтная форма атрымання адукацыі):**

– Працую ў Інстытуце мікрабіялогіі НАН Беларусі ў лабараторыі малекулярнай біятэхналогіі малодшым навуковым супрацоўнікам. Уладкаваўся на дадзенае месца на трэцім курсе, напрыканцы навучальнага года. Далей планую працягнуць навучанне ў магістратуры МДЭІ.



**Варвара Мельнікава (юрыдычны каледж БДУ, бюджэтная форма атрымання адукацыі):**

– Шчыра кажучы, у каледжы мая любоў да навукі толькі памацнела, таму я б хацела працягнуць навучанне, магчыма, у сумежных з юрыспрудэнцыяй сферах. Пры гэтым дзякуючы каледжу я магу ўжо зараз пачаць працаваць у вольны час, рэалізоўваць сябе ў прафесійнай сферы. Таму цяпер перада мной адкрыты розныя шляхі.



**Шэнай Шэнцюрк (Сумесны інстытут БДУ-ДПУ, платная форма атрымання адукацыі):**

– Я працавала сакратаром-перакладчыкам з веданнем англійскай, турэцкай, рускай, беларускай і кітайскай моў. Практыку праходзіла ў кампаніі, якая займаецца развіццём індустрыяльнага парка «Вялікі камень». Планую палепшыць веданне кітайскай мовы падчас стажыроўкі ў Кітаі, таму падаю дакументы на моўную стажыроўку, а пасля хацела б працаваць у сферы бізнесу або лагістыкі.



**Мікіта Грыцэвіч (юрыдычны факультэт, бюджэтная форма атрымання адукацыі):**

– Падчас вучобы я не працаваў, пераддыпломную практыку праходзіў у пракуратуры Заводскага раёна г. Мінска. Планаваў атрымаць размеркаванне ў пракуратуру, таму некаторы час працаваў у якасці пазаштатнага супрацоўніка ў пракуратуры Заводскага раёна г. Мінска, назапашваў вопыт. І мае чаканні апраўдаліся.



**Даніл Вараб'ёў (хімічны факультэт, бюджэтная форма атрымання адукацыі):**

– Я навучаўся на спецыяльнасці «фундаментальная і прыкладная хімія рэчываў і матэрыялаў». І вытворчую, і пераддыпломную практыку праходзіў у лабараторыі каталізу полімерызацыйных працэсаў Навукова-даследчага інстытута фізіка-хімічных праблем БДУ. Падчас праходжання вытворчай практыкі туды я і ўладкаваўся працаваць. У сувязі з тым, што я планую паступаць у магістратуру, дадзеную лабараторыю абраў у якасці месца размеркавання – зручна будзе сумяшчаць і вучобу, і працу. Усе мае чаканні апраўдаліся: я атрымаў магчымасць весці даследчую дзейнасць з перспектывай выступаць на розных канферэнцыях і публікаваць артыкулы ў вядомых навуковых часопісах.



**Юлія Кунахавец (факультэт філасофіі і сацыяльных навук, бюджэтная форма атрымання адукацыі):**

– Я скончыла навучанне па спецыяльнасці «сацыяльная работа (сацыяльна-псіхалагічная дзейнасць)». Цікаўлюся сацыяльнай псіхалогіяй, псіхалогіяй кіравання. Таму думаю працягваць вучобу і планую паступленне ў магістратуру: альбо ў БДУ, альбо ў Акадэмію кіравання.

Вельмі сумна ўсведамляць, што студэнцкія гады, тым больш такія актыўныя, якія былі ў мяне, падыходзяць да канца. Але на вачах слёзы радасці, бо далей – больш! Актыўную грамадскую дзейнасць буду працягваць.



**Уладзімір Жук (ваенны факультэт, бюджэтная форма атрымання адукацыі):**

– Вучыўся на спецыяльнасці «правазнаўства (юрысконсульцкая работа ў ваеннай сферы)». Пераддыпломную практыку я праходзіў у 38 асобнай дэсантна-штурмавой брыгадзе ў горадзе Брэсце. У перыяд дадзенай стажыроўкі было цікава ўжываць тэарэтычныя веды на практыцы, а таксама спасцігаць нешта новае па сваёй спецыяльнасці. Размеркаваны ў горад Бяроза.

**Матэрыялы развароту падрыхтавалі Ганна КАЗАКОВА і Дар'я ПАЎЛЮЧУК**

УНІВЕРСІТЭТ
21 чэрвеня 2023 года, № 6 (2271)

# Гаспадыня вучэбнага корпуса ФМА

**Ведаць кожны куток факультэцкага будынка, сачыць за парадкам і вырашаць любыя гаспадарчыя пытанні можа ніхто іншы, як камендант факультэта міжнародных адносін БДУ Святлана ЯРКОВІЧ. Карэспандэнт газеты «Універсітэт» след услед прайшоў па яе працоўных сцяжынах.**



*Аб'ём працы людзей, якія шчыруюць на карысць універсітэта, нярэдка аказваецца не навідавоку, саступаючы першае месца плёну іх прафесійнай дзейнасці. У новай рубрыцы «Працоўны дзень» газета «Універсітэт» будзе знаёміць чытачоў з буднямі супрацоўнікаў БДУ розных профіляў.*

– Я добрасумленны чалавек, шчыры. Не ўмею падманваць – як дома, так і на працы. І калі табе давяраюць у калектыве, гэта, відаць, пра нешта гаворыць. Маё захапленне – дача: там я вырошчваю розныя гатункі кветак, і ўсю пенсію магу з лёгкасцю патраціць на насенне. Таксама я вяжу: раней гэта былі касцюмы, світары, а зараз болей займаюся шкарпэткамі. У мяне трое дзяцей і пяцёра ўнукаў, таму поле для творчасці вялікае, – дае кароткую даведку пра сябе мая суразмоўца.

## «Генадзьеўна», ці Нешта на прафесійнай мове

Працоўны дзень каменданта пачынаецца ў 8.30 і заканчваецца ў 17.15. Але Святлана Генадзьеўна на працы ўжо а восьмай гадзіне. Спачатку ёй трэба зрабіць штодзённы ранішні абход сваёй гаспадаркі, а таксама пагутарыць з калектывам: тэхнічны персанал якраз закрывае змену. У 402 кабінеце Святлана Генадзьеўна не толькі распытвае калег пра працоўныя моманты, але і цікавіцца навінамі з іх асабістага жыцця.

Падчас абходу высвятляецца, што сярод падначаленых каменданта – 24 чалавекі: 21 прыбіральшчыца, дворнік і два сталяры. Святлана Ярковіч кажа, што з самага першага дня стараецца выбудаваць з калегамі працоўна-сяброўскія адносіны. Як кіраўніку, ёй хочацца глыбей ведаць праблемы сваіх калег. Магчыма, таму супрацоўнікі ласкава называюць яе Генадзьеўнай. Дарэчы, другое «імя» мой праваднік атрымала і ў кіраўніцтва: у галоўным гаспадарчым упраўленні і на факультэце яе празвалі гаспадыняй.

З выкладчыкамі ў каменданта і яе калег таксама наладжаны добрыя сувязі. Калі, напрыклад, на нейкай кафедры трэба адрамантаваць стул, яго выстаўляюць, а сталяр ведае, што гэту рэч трэба прывесці ў парадак. Неабходна працерці за шафай ці ў іншым цяжкадаступным месцы – супрацоўнікі факультэта робяць тэхнічнаму персаналу пазнаку.

– Цаню працу сваіх калег, кажу, што дома мы ўсе прыбіральшчыкі. А хіба факультэт нечым адрозніваецца? Кінуў нехта паперку, а ты ўбачыў – трэба падняць. Калі раптам дзяжурны прыбіральшчык сышоў, а трэба нешта працерці ці вынесці, – ідзеш і робіш, – адзначае мая суразмоўца. – Калі некаму здаецца, што гэта праца занадта лёгкая, варта адзін дзень пахадзіць са швабрай і анучай. Тады пытанне адпадзе само па сабе.

Бачна, што каменданта на факультэце паважаюць: пакуль я шчоўкаю затворам фотаапарата, выкладчыкі, бачачы Святлану Ярковіч, усміхаюцца, вітаюцца, калі-нікалі жартуюць: «Гэта ў Вас фотасесія, Святлана Генадзьеўна?»

– У мяне ўсё проста. Калі з людзьмі камунікуеш на адным узроўні, так заўсёды, – упэўніла камендант. – І сваіх супрацоўнікаў да гэтага прывучаю. Да ўсіх людзей патрэбна ставіцца аднолькава і з павагай.

## «Павуціна – жалоба, таму яе няма»

У полі зроку каменданта штодзень аказваюцца гарышча, 13 паверхаў, падвальныя памяшканні, склады і тэрыторыя перад будынкам ФМА. А галоўныя задачы, якія стаяць перад ёй, – захаванне маёмасці, рамонт і парадак на факультэце. Адказная за гаспадарку дэманструе дагледжаныя фае, лесвіцы і ліфты:

– Ведаеце, для мяне павуціна – гэта проста жалоба. Таму яе і няма нідзе!

Пакуль мы працягваем аглядаць факультэцкія «ўладанні», Святлана Генадзьеўна дзеліцца сваёй гісторыяй:

– У лістападзе споўніцца 15 гадоў, як я працую ў БДУ. Дагэтуль займала пасаду загадчыцы гаспадаркі ў дзіцячым садку, была хатняй гаспадыняй. Затым – у 2008 годзе – я прыйшла працаваць у Інстытут журналістыкі БДУ. А праз чатыры гады я стала камендантам ФМА. Вялікі новы будынак стаў для мяне вялікай адказнасцю. Першы час прыйшлося ўлівацца: праглядала дакументы, знаёмілася са спецыфікай працы. Калі нешта было незразумела – раілася з дэканам ці старэйшымі камендантамі. На ФМА я была яшчэ з будаўнікамі: знаёмілася з кабінетамі, расстаўляла мэблю, набірала тэхнічны персанал. І нават зараз ведаю, што стаіць у кожным кабінеце. А з калегамі мы камунікуем пастаянна: усе каменданты ведаюць адзін аднаго, выручаюць. Заўсёды ў гутарку можна напісаць «дайце сталяра» ці «патрэбен такі замок».

Звоніць мабільны тэлефон – каменданту трэба перадаць сталяру дзвярныя ручкі на замену:

– Падыходзьце на чацвёрты паверх, усё выдам, – адказвае Святлана Генадзьеўна, і мы накіроўваемся да склада.

Знізу нас ужо чакае сталяр Віктар Пятровіч Мінютка. Ён разам з Казімірам Станіслававічам Данілевічам спяшаецца на дапамогу, калі ў каменданта просяць паправіць замок, зрабіць устойлівым стол ці нешта падобнае.

Камендант кажа, што гэтыя спецыялісты ў яе «на разрыў»: яны запатрабаваны не толькі на ФМА, але і па ўсім універсітэцкім гарадку.

– Здараецца, што прыходзіцца спрачацца, калі іх патрэбна некуды «перакінуць». Думаеце, сваёй работы не хапае, кажу, – смяецца гаспадыня факультэта. – Зусім нядаўна сталяры клалі тынкоўку. А тынкоўка – такі матэрыял: хто заўгодна за яе не возьмецца, самі разумееце.

За дзве гадзіны каменданту сем разоў тэлефанавалі на асабісты тэлефон і двойчы – на працоўны, чатыры задачы па мабільным паставіла яна.



– Віктар Пятровіч, без пятнаццаці дзесяць трэба падысці да рэктарата, – акрэсліла нарад камендант.

– Зразумеў, буду, – адгукаецца ў трубцы. А Святлана Генадзьеўна прызнаецца, што ў насычаныя дні колькасць толькі ўваходных выклікаў дасягае дваццаці.

У скарбонцы прафесійных гісторый каменданта ФМА ёсць і такая: аднойчы працоўны кабінет Святланы Генадзьеўны на два тыдні ператварыўся ў майстэрню па абшыўцы банкетак. «Банкетачны цэх», як жартаўліва празвалі яго супрацоўнікі. Тады факультэту патрэбна было змяніць абіўку на 150 банкетках. Святлана Генадзьеўна прапанавала кіраўніцтву, каб у мэтах эканоміі супрацоўнікі самі ажыццявілі гэты праект. Так, факультэт закупіў матэрыялы, а калектыў закасаў рукавы: сталяры зрабілі прыстасаванні для выкрайкі, гардэробшчыцы краілі, а сама камендант абмётвала матэрыял. Праз 14 дзён мэбля выглядала як з салона.

– Мы заўсёды нясём з дому тое, чаго не хапае. Напрыклад, трэба прывесці ў парадак стул, а ён на клей не бярэцца – шукаем маленькія цвікі. Неабходна адрамантаваць дзверы – сталяры прыносяць засовы. Усім хочацца, каб усё навокал добра працавала, – кажа Святлана Генадзьеўна.

## «З радасцю іду на працу: яна мне падабаецца»

Абед у каменданта доўжыцца з 13.00 да 13.45. Аднак нярэдка ў гэты час спецыялісту патрэбна вырашыць нейкія гаспадарчыя пытанні: разгрузіць машыну, запоўніць дакументы, аформіць спісанне. Заўсёды на пасту Святлана Ярковіч знаходзіцца і тады, калі на факультэце праходзяць буйныя студэнцкія мерапрыемствы ці чакаюцца замежныя дэлегацыі:

– У мяне ўсё заўсёды ёсць. Даюся дзіву, калі людзі гавораць, што ім нечага не хапае.

Першы, хто даведваецца пра тэхнічныя надзвычайныя сітуацыі на факультэце, – таксама Святлана Генадзьеўна. Камендант прыгадвае адзіны сур'ёзны выпадак падтаплення, заўважыўшы які, супрацоўнікі адразу ж патэлефанавалі ёй.

– Нехта зняў з умывальніка шланг зліву. І пакрысе прыбіральню на адным з паверхаў пачало заліваць. Мне тут жа патэлефанавалі. Мы з мужам хутка прыехалі – вады было ўжо па шчыкалатку – і неўзабаве ўсё вырашылі.

У дадатак да службовых абавязкаў апошнія тры гады Святлана Ярковіч узначальвае прафсаюзную ячэйку галоўнага гаспадарчага ўпраўлення БДУ. Таму частымі гасцямі на стале спецыяліста аказваюцца членскія білеты, заявы на пуцёўкі, матэрыяльныя заахвочванні ці сацыяльныя выплаты. Гэта таксама занятасць, якой патрэбна прысвячаць нямала часу штодня.

Якраз па лініі прафсаюзнай арганізацыі з пытаннямі да каменданта завітвае адміністратар Інэса Віктараўна Другава. Яшчэ з парога гаспадыня кабінета цікавіцца надзённымі працоўнымі пытаннямі:

– Ну як, павесілі кручкі? А палічкі?

– Павесілі – цудоўна ўсё. І мыльніцы таксама!

Пакуль Святлана Генадзьеўна кансультуе калегу, аглядаю яе кабінет: на сценах красуюцца нізкі ключоў, у шафе – звязаныя на прутках цацкі, якія ёй падаравалі майстрыцы-калегі. На сценах размясціліся ўдзячнасці і сертыфікат, які нагадвае пра цікавую падзею ў жыцці каменданта. У 2013 годзе над БДУ пралятаў касмічны карабель. Узнікла ідэя звязацца з касманаўтамі, а максімальна спрыяльныя ўмовы для добрай сувязі з імі складваліся апоўначы. Паўдзельнічаць у незвычайнай гутарцы тады прапанавалі студэнтам, выкладчыкам і супрацоўнікам БДУ. Па словах спецыяліста, спачатку сяміхвілінны сеанс сувязі не падаваўся нечым звышардынарным, але, калі студэнты пачалі задаваць пытанні, з'явілася ўзвышанасць, гонар за тое, што звязацца з касманаўтамі змог менавіта БДУ.




*– Што самае прыемнае ў вашай рабоце? А што самае складанае?*

– Канешне, самае прыемнае ў рабоце – калі пастаянна камунікуеш з людзьмі і калі цябе хваляць. У такія імгненні разумееш, што патрэбны, – пераканана камендант ФМА. – А цяжкасцей тут не бывае: я з радасцю іду на працу. Проста яна мне падабаецца. Калі ў цябе самога ўсё добра, то гэта перадаецца людзям навокал, я так думаю.

А яшчэ ў мяне ёсць мара, каб гаспадарчыя аддзелы лепей узаемадзейнічалі адзін з адным. Не так, каб людзі абмяжоўваліся сваімі абавязкамі, а каб галоўнае гаспадарчае ўпраўленне было адзіным цэлым, незалежна ад спецыфікі работы, якую выконваюць усе яго падраздзяленні.

Ірына ІВАШКА

# «Пазнаёміліся на трэніроўцы». Як рукапашны бой звязаў пару выкладчыкаў БДУ

**Антаніна і Яўген Манько – сямейная пара выкладчыкаў БДУ. Спартсмены вядуць заняткі па фізічнай культуры са студэнтамі і прадстаўляюць гонар краіны на міжнароднай арэне.**

У 2017 годзе, студэнткай Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта фізічнай культуры, Антаніна стала чэмпіёнкай Еўропы па ММА. Таксама ў яе кар'еры некалькі медалёў з еўрапейскіх і беларускіх чэмпіянатаў па рукапашным баі.

Яўген – майстар спорту міжнароднага класа па рукапашным баі, змешаных адзінаборствах, грэплінгу, майстар спорту па ўшу-саньда, панкраціёне і баявым самба. У 2020 годзе ён стаў чэмпіёнам свету сярод прафесіяналаў па змешаных адзінаборствах.

**– Як пачалася ваша спартыўная кар'ера?**

**Антаніна:** Я пачала займацца адзінаборствамі ў 20 гадоў, калі вучылася на 3 курсе БДУФК. Адразу пайшла ў секцыю па змешаных баявых адзінаборствах, куды мяне запрасіў сябар. Спачатку проста падтрымлівала агульную фізічную падрыхтоўку, але гэты від спорту мяне моцна зацікавіў. Пазней была запрошаная ў агульную групу і займалася адзінаборствамі з хлопцамі. Засталася там да канца навучання і стала прафесійнай спартсменкай.

**Яўген:** Спачатку я займаўся шахматамі, потым паспрабаваў цыклічныя віды спорту. Аднойчы мама сказала, што насупраць нашага дома адкрыўся цэнтр пазашкольнай працы, дзе выкладае малады трэнер па тайскім боксе. Тады мне было гадоў 15, і я пачаў займацца тайскім боксам.

Мой сябар, з якім мы разам хадзілі на трэніроўкі, паступіў у БДУФК. У той час там працаваў малады трэнер па рукапашным баі і змешаных адзінаборствах. На адной з нашых трэніровак па тайскім боксе сябар распавёў, маўляў, ва ўніверсітэце на занятках было шмат барацьбы. Наш трэнер спытаў: «Якія прыёмы вы вывучаеце?» Сябар адказаў: «Сёння была кідковая тэхніка, прагібы». Мы папрасілі яго паказаць некаторыя прыёмы. І нам моцна спадабалася. Хоць у нас нават матаў не было. Я папрасіў сябра пагаварыць з трэнерам, каб і я мог хадзіць у секцыю. Але на той момант я не быў студэнтам і мог наведваць трэніроўкі толькі платна. А я «басяк з Камароўкі», адкуль у мяне грошы? Таму пачаў займацца рукапашным боем, толькі калі паступіў ва ўніверсітэт.

**– Чым рукапашны бой адрозніваецца ад бокса?**

**Я:** У першую чаргу бокс адрозніваецца ад рукапашнага бою візуальна. Форма ў спартсменаў розная. У боксе – шорты, белая майка і спецыяльныя абутак, баксёркі. Адзенне ў рукапашным баі – кімано. Яно аднакаляровае: альбо белае, альбо колеру хакі. Кімано апранаюць з поясам альбо сіняга, альбо чырвонага колеру. Але, калі ты становішся чэмпіёнам свету, можаш насіць і чорны пояс. Таксама моцна адрозніваюцца пальчаткі. У боксе яны 10-унцыевыя з закрытымі пальцамі. У рукапашным баі – адкрытыя 10-унцыевыя пальчаткі. У такіх больш ніхто не можа баксіраваць. Дарэчы, баксёрскія пальчаткі можна выкарыстоўваць і ў кікбоксінгу. Рукапашныя – не. Яны адкрытыя, іх вырабляе спецыяльная фірма. Шлем такі ж, як і ў боксе, – адкрыты баявы.

Правілы відаў спорту таксама моцна адрозніваюцца. У боксе існуе тры ўдары: прамы, бакавы і ўдар знізу – аперкот. У рукапашным баі ты можаш выкарыстоўваць кругавыя і «доўгія» ўдары, прабіваць з развароту, рабіць далёкія ўдары і бэкфісты. Таксама дазваляюцца ўсе ўдары нагамі з кікбоксінгу, каратэ і таэквандо. Плюс да ўсяго, тут ёсць элементы барацьбы: кідкі з дзюдо, самба і грэка-рымскай барацьбы. Таксама ў партэры дазваляецца выконваць баявыя прыёмы на здушэнне, але на яго рэалізацыю даецца пяць секунд, а на выкананне – 20. Калі праходзіць гэты час і няма ніякай актыўнасці, то спартсмены ўстаюць у стойку і пачынаюць баксіраваць для відовішчнасці саміх спаборніцтваў. Бо многім гледачам не падабаецца «валтузня» ў партэры. Раўнд у аматарскім рукапашным баі доўжыцца пяць хвілін. У боксе – тры раўнды па тры хвіліны.








**– Чаму і калі вы пачалі працаваць у БДУ?**

**Я:** У нас з Антанінай агульная гісторыя: мы абодва скончылі Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт фізічнай культуры і цяпер выкладаем у БДУ. Я вучыўся на спецыяльнасці «спартыўна-педагагічная дзейнасць» і атрымаў кваліфікацыю «трэнер па рукапашным баі. Выкладчык фізічнай культуры». Антаніна вучылася на спецыяльнасці «фізічная культура (лячэбная)». Выпускаліся мы ў адзін год. Па размеркаванні трапілі ў спартыўны клуб. Гэта падраздзяленне дапамагае ў арганізацыі спартыўных мерапрыемстваў у БДУ, збірае валанцёраў і запрашае балельшчыкаў на розныя мерапрыемствы. Напрыклад, клуб ладзіць сустрэчы з удзельнікамі Алімпійскіх гульняў, а таксама арганізоўвае рэспубліканскія турніры па розных відах спорту. Таму мы займаліся арганізатарскай і валанцёрскай працай. Са спартыўнага клуба я пераразмеркаваўся і пачаў выкладаць у БДУФК на кафедры, якую скончыў.

Праз два гады наш трэнер, Півавараў Андрэй Яўгенавіч, зноў «аб'яднаў» мяне і Антаніну. Ён прапанаваў нам папрацаваць выкладчыкамі на кафедры фізічнага выхавання і спорту БДУ. Нам падыходзіў графік і заработная плата, таму мы пагадзіліся.

**– Студэнты зацікаўленыя ў занятках фізічнай культурай?**

**А:** На розных факультэтах студэнты паводзяць сябе па-рознаму. У мяне ўсе навучэнцы зацікаўленыя, заўсёды рады дапамагчы і жадаюць паўдзельнічаць у многіх спаборніцтвах. Я працую на геаграфічным факультэце, а Жэня на механіка-матэматычным.

**Я:** Студэнты, якія маюць спартыўныя разрады, ідуць у секцыі з самага пачатку навучання ва ўніверсітэце. Калі на занятках фізічнай культурай мы знаходзім таленавітых навучэнцаў, бачым у іх патэнцыял, таксама адпраўляем іх у секцыі.

*Я лічу важным, што кожны студэнт БДУ можа выбраць менавіта тое, што яму цікава. Як правіла, хлопцы і дзяўчаты выбіраюць секцыі мэтанакіравана і пазней годна прадстаўляюць універсітэт на розных турнірах.*

**– Як рукапашны бой развіваецца ў БДУ і ў Беларусі ў цэлым?**

**Я:** У нашым універсітэце рукапашны бой развіты на ваенным факультэце. Магчыма, таму, што гэта важны кампанент іх прафесійнай падрыхтоўкі. Рукапашны бой дзеліцца на спартыўны і прыкладны з элементамі самаабароны. Яго не адразуператварылі ў спартыўны і зрабілі для грамадзянскіх. На ваенным факультэце ж існуе і спартыўны рукапашны бой, і армейскі.

**А:** У Беларусі ёсць Федэрацыя рукапашнага бою і змешаных баявых адзінаборстваў (на кафедры змешаных баявых адзінаборстваў і спецыяльнай падрыхтоўкі БДУФК). Мы з'яўляемся членамі нацыянальнай зборнай. Наш склад, дарэчы, зараз рыхтуецца да летняга турніру. Нядаўна завяршыўся апошні тыдзень трэніровак, і зборная адправіцца на чэмпіянат свету ў Астану (Казахстан).

**– Калі вы пазнаёміліся, адразу разглядзелі адзін у адным другую палову?**

**Я:** Мы пазнаёміліся на трэніроўцы. Доўгі час успрымалі адзін аднаго як спарынг-партнёраў, памочнікаў і аднаклубнікаў. Мы трэніраваліся адзін з адным на працягу шасці гадоў, былі як брат і сястра.

**А:** Памятаю, мы з Жэнем ездзілі на чэмпіянат Еўропы па ММА ў Дрэздэн. Нашу каманду прадстаўлялі толькі мы ўдваіх. Сярод усіх удзельнікаў я была адзінай дзяўчынай. Хлопцам з іншых клубаў Жэня казаў: «Гэта мая сястра, не крыўдзіць яе». Пазней мы адправіліся на зборы, дзе знаходзіліся разам кругласутачна. Аказалася, у нас шмат агульнага. Думаю, калі зачыніць мужчыну і жанчыну ў адным месцы на працяглы час, то яны альбо адзін аднаго заб'юць, альбо пажэняцца.

**Ілья ВАРАБ'ЁЎ**

УНІВЕРСІТЭТ
21 чэрвеня 2023 года, № 6 (2271)

# ПЕРАЛІК РАБОТ, ПАДАДЗЕНЫХ ДЛЯ ЎДЗЕЛУ Ў 2023 ГОДЗЕ Ў КОНКУРСЕ НА СУІСКАННЕ ПРЭМІЙ ІМЯ У. І. ПІЧЭТЫ І А. Н. СЕЎЧАНКІ Ў 2023 ГОДЗЕ (1 ЭТАП)

| Катэгорыя конкурсу | А. Н. Сеўчанкі | У. І. Пічэты |
|---|---|---|
| Асноўны конкурс | *У намінацыі «Навука»*<br><br>Камітэт «Хімія»<br>Хімічны факультэт<br>1. Работа «Новыя каталізатары полімерызацыі ізабутылену: сінтэз функцыяналізаваных поліізабутыленаў і блок-супалімераў на аснове ізабутылену»<br>Аўтар: Касцюк Сяргей Віктаравіч, доктар хімічных навук, прафесар, загадчык кафедры высокамалекулярных злучэнняў<br><br>Камітэт «Фізіка»<br>Факультэт радыёфізікі і камп’ютарных тэхналогій<br>1. Работа «Паўправадніковыя квантава-памерныя гетэралазеры на міжзонных і ўнутрыпадзонных пераходах»<br>Аўтары: Афоненка Аляксандр Анатольевіч, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар, загадчык кафедры квантавай радыёфізікі і оптаэлектронікі; Ушакоў Дзмітрый Уладзіміравіч, доктар фізіка-матэматычных навук, дацэнт, дэкан факультэта радыёфізікі і камп’ютарных тэхналогій<br><br>*У намінацыі «Адукацыя»*<br><br>Камітэт «Хімія»<br>Хімічны факультэт<br>1. Работа «Цыкл навучальных матэрыялаў для выкладання дысцыплін зялёнай хіміі ва ўстановах адукацыі»<br>Аўтары: Савіцкая Таццяна Аляксандраўна, прафесар кафедры фізічнай хіміі, доктар хімічных навук; Кімленка Ірына Міхайлаўна, дацэнт кафедры радыяцыйнай хіміі і хіміка-фармацэўтычных тэхналогій, кандыдат хімічных навук<br><br>Камітэт «Біялогія, геаграфія і экалогія»<br>Факультэт геаграфіі і геаінфарматыкі<br>1. Работа «Цыкл навучальных і навучальна-метадычных прац у галіне рэгіянальнай геалогіі для лічбавізацыі геолага-геаграфічнай адукацыі»<br>Аўтары: Твартановіч-Сяўрук Данііл Леанідавіч, дацэнт кафедры рэгіянальнай геалогіі, кандыдат геаграфічных навук; Зуй Уладзімір Ігнатавіч, прафесар кафедры рэгіянальнай геалогіі, доктар геолага-мінералагічных навук; Лукашоў Алег Валянцінавіч, загадчык кафедры рэгіянальнай геалогіі, кандыдат геолага-мінералагічных навук, дацэнт | *У намінацыі «Навука»*<br><br>Камітэт «Правазнаўства і міжнародныя адносіны»<br>Юрыдычны факультэт<br>1. Работа «Цыкл навуковых прац, якія абгрунтоўваюць напрамкі і спосабы ўдасканалення механізму рэалізацыі права на судовую абарону ў цывілістычным працэсе»<br>Аўтар: Скобелеў Уладзімір Пятровіч, кандыдат юрыдычных навук, намеснік дэкана па вучэбнай рабоце і адукацыйных інавацыях (завочная форма навучання), дацэнт кафедры грамадзянскага працэсу і працоўнага права юрыдычнага факультэта<br><br>Камітэт «Філалогія і журналістыка»<br>Філалагічны факультэт<br>1. Работа «Комплекс навуковых прац, прысвечаных сімваліка-эстэтычнай трактоўцы культуры ў галіне ідэалогіі, адукацыі, мастацкай славеснасці за 2013–2023 гг.»<br>Аўтар: Шамякіна Таццяна Іванаўна, доктар філалагічных навук, прафесар кафедры тэарэтычнага і славянскага літаратуразнаўства<br><br>Факультэт сацыякультурных камунікацый<br>1. Работа «Мартальныя матывы англійскай літаратуры»<br>Аўтар: Зялезінская Наталля Станіславаўна, кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры тэорыі і практыкі перакладу<br><br>Факультэт журналістыкі<br>1. Работа «Фотажурналістыка»<br>Аўтар: Шымолін Віктар Іванавіч, кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры перыядычнага друку і вэб-журналістыкі<br><br>Камітэт «Гісторыя, філасофія, псіхалогія, педагогіка»<br>Факультэт сацыякультурных камунікацый<br>1. Работа «Канцэпты сучаснасці: комплекс інавацыйных даследаванняў, прысвечаных культурна-гістарычнай своеасаблівасці і сусветнаму значэнню сучаснага беларускага і расійскага мастацтва, дызайну і архітэктуры»<br>Аўтар: Духан Ігар Мікалаевіч, доктар філасофскіх навук, кандыдат архітэктуры, дацэнт, загадчык кафедры мастацтваў і асяроддзевага дызайну<br><br>Гістарычны факультэт<br>1. Работа «Навуковыя картаграфічныя матэрыялы па гісторыі (2014–2023 гг.)»<br>Аўтар: Цемушаў Сцяпан Мікалаевіч, доктар гістарычных навук, дацэнт, прафесар кафедры гісторыі Расіі<br><br>Факультэт філасофіі і сацыяльных навук<br>1. Работа «Калекцыя фундаментальных навукова-даследчых прац, якія абгрунтоўваюць ролю духоўнай і сацыяльнай культуры беларускага народа ў пераемнасці традыцый і забеспячэнні камунікацыі пакаленняў»<br>Аўтар: Калачова Ірына Іванаўна, доктар гістарычных навук, прафесар кафедры сацыяльнай камунікацыі |
| Конкурс маладых навукоўцаў | | |
| Дактары навук да 45 гадоў | не | не |
| Кандыдаты навук да 35 гадоў | *У намінацыі «Навука»*<br><br>Камітэт «Фізіка»<br>Фізічны факультэт<br>1. Работа «Механізмы рэгуляцыі функцыянальнай актыўнасці клетак крыві біянанаматэрыяламі пры акісляльным/галагеніруючым стрэсе»<br>Аўтар: Грыгор’ева Дар’я Уладзіміраўна, кандыдат біялагічных навук, дацэнт кафедры біяфізікі<br><br>Камітэт «Біялогія, геаграфія і экалогія»<br>Факультэт геаграфіі і геаінфарматыкі<br>1. Цыкл работ «Водаабмен азёр Беларусі як фактар іх устойлівасці і ўразлівасці да знешняга ўздзеяння»<br>Аўтар: Сухавіла Ніна Юр’еўна, кандыдат геаграфічных навук, загадчык НДЛ возеразнаўства кафедры агульнага землязнаўства і гідраметэаралогіі | *У намінацыі «Навука»*<br><br>Камітэт «Філалогія і журналістыка»<br>Філалагічны факультэт<br>1. Работа «Феномен культурнага памежжа ў творчасці Іва Андрыча»<br>Аўтар: Навумова Ганна Уладзіміраўна, кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры тэарэтычнага і славянскага мовазнаўства<br><br>Камітэт «Гісторыя, філасофія, псіхалогія, педагогіка»<br>Гістарычны факультэт<br>1. Работа «Навуковыя публікацыі па праблеме выкарыстання гісторыка-культурнай спадчыны ў турыстычнай дзейнасці (2014–2023 гг.)»<br>Аўтар: Філіпчык Дзяніс Уладзіміравіч, кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры этналогіі, музеалогіі і гісторыі мастацтваў |
| Маладыя навукоўцы, без ступені да 30 гадоў | *У намінацыі «Навука»*<br><br>Камітэт «Фізіка»<br>НДІ ПФП імя А. Н. Сеўчанкі БДУ<br>1. Работа «Шматузроўневыя вымярэнні спектральных характарыстык іглічных насаджэнняў і аналіз іх вынікаў для выяўлення ачагоў усыхання на ранніх стадыях»<br>Аўтары: Літвіновіч Глеб Святаслававіч, навуковы супрацоўнік лабараторыі оптыка-фізічных вымярэнняў; Ламака Аляксей Андрэевіч, навуковы супрацоўнік лабараторыі дыстанцыйнай фатаметрыі; Сілюк Вольга Алегаўна, навуковы супрацоўнік лабараторыі дыстанцыйнай фатаметрыі<br><br>Камітэт «Матэматыка, інфарматыка»<br>Факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі<br>1. Работа «Уласцівасці выпадковых блуканняў на слабых экспандарах»<br>Аўтар: Задаражнюк Ганна Алегаўна, асістэнт кафедры вышэйшай матэматыкі<br><br>Механіка-матэматычны факультэт<br>1. Работа «Механіка-матэматычнае мадэляванне складаных геатэхнічных сістэм»<br>Аўтар: Нікалайчык Міхаіл Аляксандравіч, загадчык навукова-даследчай лабараторыі прыкладной механікі кафедры тэарэтычнай і прыкладной механікі | |

# Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт аб’яўляе конкурс

## на замяшчэнне пасад прафесарска-выкладчыцкага складу

| Эканамічны факультэт | | |
|---|---|---|
| Назва пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду* | Кваліфікацыйныя патрабаванні да пасады паводле АКДП і службовай інструкцыі |
| Загадчык кафедры аналітычнай эканомікі і эканаметрыкі | 4 гады | Вышэйшая адукацыя, навуковая ступень доктара ці кандыдата навук, наяўнасць навуковых прац ці вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не меней за 7 гадоў. |
| Дацэнт кафедры міжнароднай палітычнай эканоміі | 4 гады | Вышэйшая адукацыя, навуковая ступень доктара ці кандыдата навук, наяўнасць навуковых прац ці вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не меней за 5 гадоў. |
| Дацэнт кафедры інаватыкі і прадпрымальніцкай дзейнасці | 3 гады | |
| Дацэнт кафедры аналітычнай эканомікі і эканаметрыкі | 3 гады | |
| Выкладчык кафедры міжнароднага менеджменту | | Вышэйшая адукацыя, якае адпавядае педагагічнай дзейнасці, ці вышэйшая адукацыя, што адпавядае навучальнаму прадмету (навучальнай дысцыпліне), і перападрыхтоўка па профілях «Педагогіка», «Педагогіка. Прафесійная адукацыя» без прад’яўлення патрабаванняў да стажу працы. |
| Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе: г. Мінск, вул. К. Маркса, д. 31, каб.65; да 20 ліпеня.<br>Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу: г. Мінск, вул. К. Маркса, д. 31, каб.65; да 18 жніўня. | | |

*(дацэнт, прафесар, намеснік загадчыка агульнаўніверсітэцкай кафедры, загадчыка кафедры)

**НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЯ ЎСТАНОВА «ІНСТЫТУТ ПРЫКЛАДНЫХ ФІЗІЧНЫХ ПРАБЛЕМ ІМЯ А. Н. СЕЎЧАНКІ» БДУ**

**АБ’ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАДЫ:**

СТАРШАГА НАВУКОВАГА СУПРАЦОЎНІКА лабараторыі эліёнікі па спецыяльнасці 01.04.07 (фізіка кандэнсаванага стану).

*Тэрмін конкурсу – месяц з дня апублікавання аб’явы.*

*Дакументы накіроўваць на адрас: г. Мінск, вул. Курчатава, 7, аддзел кадраў (каб. 230).*

*Тэлефон аддзела кадраў 270-48-43.*

# СТУДЭНЦКІЯ ПРЫЗНАЧЭННІ

**Старшынёй савета зямляцтваў БДУ абраны другакурснік юрыдычнага факультэта Ахмед ТАЎСУЛТАНАЎ, намеснікам старшыні – першакурснік філалагічнага факультэта Вэнь ЮЙКЭ.**




Кандыдатуры былі зацверджаны 1 чэрвеня падчас пасяджэння кіраўнікоў савета зямляцтваў БДУ. У мерапрыемстве прынялі ўдзел прарэктар па выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях Ганна Бакун, начальнік упраўлення па выхаваўчай рабоце з моладдзю Кацярына Зуева, начальнік упраўлення міжнародных сувязяў Аляксандр Жук і актывісты савета зямляцтваў.

Са справаздачай аб праведзенай рабоце савета за 2022-2023 гады выступіў экс-старшыня чацвёртакурснік факультэта міжнародных адносін Азамат Бабоеў. Кандыдаты прадставілі сваю праграму развіцця арганізацыі на будучы навучальны год. Падзячныя лісты савета зямляцтваў БДУ былі ўручаны актывістам за іх уклад у развіццё і ўсебаковую падтрымку арганізацыі.

# ДА ЎВАГІ







УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082 ад 21 студзеня 2010 года

Падпісана да друку 21.06.2023 г.
Зак. 520. Тыраж 1000 экз.
Надрукавана на Дзяржаўным прадпрыемстве «БудМедыяПраект».
ЛП № 02330/71 ад 23.01.2014 220123, Мінск, вул. В. Харужай, 13/61.

**Рэдактар Дар’я Аляксандраўна ПАЎЛЮЧУК**
Карэктар Ганна Яўгенаўна РАК
Адрас рэдакцыі: 220004, г. Мінск, вул. Кальварыйская, 9, каб. 804, 802, тэл. 259-70-77, 259-70-65
***e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by***